УДК 811.161.3

# УЖЫВАННЕ БЕЛАРУСКІХ ПРЫКАЗАК І ПРЫМАВАК У ГАЛІНЕ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

**Кудласевіч А. А.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Народная мудрасць заўседы была аўтарытэтам для людзей. Нашы продкі ведалі многія сакрэты: што можна рабіць і што нельга рабіць. Напрыклад, мая бабуля заўседы гаварыла, што нельга крышь капусту на маладзік, бо будзе зусім нясмачная. Але ўсе ведалі і тое, што, калі маладзік, то добра касіць траву – хутка адрасце атава. Вось у такіх асаблівасцях, тонкасцях нам перадалося шмат прыказак і прымавак. У іх сутнасці мы і назіраем мудрасць і веды нашага беларускага народа. Некаторыя прыклады мы і разгледзім.

1. На чорным полі бела пшаніца родзіць.

Значэнне гэтай прыказкі заключаецца ў тым, што дрэннае поле ніколі не дасць добрага ўраджаю, калі на яго не ўносіць удабрэнне. У гэтай прыказцы выкарыстоўваецца наступны агранамічны тэрмін: пшаніца – сельскагаспадарчая культура, якая шырока вырошчваецца у многіх краінах Еўропы, Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі. Кожны год пшаніца прыносіць даволі вялікі ўраджай, таму з'яўляецца галоўнай сельскагаспадарчай культурай на сусветных рынках. Пшаніца выкарыстоўваецца для вытворчасці мукі, з якой потым выпякаюць хлеб. Пшаніца шырока выкарыстоўваецца ў якасці корму для сельскагаспадарчых жывел. На тэрыторыі Беларусі на большай частцы ворыўнай зямлі вырошчваецца менавіта гэта культура.

2. Дзе пасееш густа, там не будзе пуста.

Дадзеная прыказка сведчыць аб тым, што на кожным полі патрэбна ўмеру высяваць любыя віды сельскагаспадарчых культур. Норму высева патрэбна рэгуляваць у залежнасці ад якасці глебы. Перад новым пасевам глебу патрэбна падрыхтаваць: узараць, прабаранаваць, пракультываваць. Культываванне глебы патрэбна праводзіць, калі растане снег.

3. Выходзь на поле з расою, дык будзеш з ядою.

Значэнне гэтай прыказкі заключаецца ў тым, што ўсе работы па апрацоўцы глебы патрэбна праводзіць своечасова. Калі спазніцца з апрацоўкай, то можна атрымаць вялікія страты ва ўраджаі. Кожная сельскагаспадарчая культура мае свой пэўны час высева. Вясеннія



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

работы па апрацоўцы глебы патрэбна пачынаць тады, калі тэмпература паветра стане вышэй нуля і на палях растане ўвесь снег. Яшчэ патрэбна памятаць пра той фактар, што падчас вясенніх работ тэмпература паветра можа змяняцца з дадатнай на адмоўную. Таму глебу патрэбна падрыхтаваць да нечаканых замаразкаў. Гэтыя ваганні тэмператур могуць вельмі пашкодзіць пасевы.

4. Не чакай з неба дараванага хлеба.

Значэнне гэтай прыказкі ў тым, што каб мець ежу, патрэбна добра папрацаваць. Нашы продкі здаўна вельмі любілі, паважалі і шанавалі хлеб. Яны лічылі, што хлеб – гэта самы вялікі скарб на стале. Хлеб выпякаюць з мукі, якую атрымліваюць пры апрацоўцы ўраджаю пшаніцы. Калісьць людзі не ведалі колькі патрэбна ўдабрэнняў і ўгнаенняў для ўрадлівасці, пагэтаму крапатліва працавалі дзеля добрага выніку. Да цяперашняга часу ў многіх славянскіх народаў захавалася такая традыцыя: на вяселле маладых перш за ўсе частуюць хлебам з соллю. Гэта традыцыя захавалася ў славян з даўніх часоў.

5. Летні дзень год корміць.

Гэта вельмі яскравая прыказка, якая прадугледжвае ў самую гарачую пару года шчырую працу, каб потым сабраць вялікі ураджай. Раней нашы продкі лічылі, што калі летам будзеш «сядзець склаўшы рукі», то зімой будзеш галадаць. Каб атрымліваць добры ўраджай, зямлю патрэбна абрабляць і ўдабраць. Беларусы здаўна ведалі, што добры ўраджай залежыць не толькі ад працы чалавека на зямлі, але і кліматычных умоў мясцовасці У наш час чалавек навучыўся кантраляваць нават гэты фактар.

Такім чынам, можам зрабіць вывад, што нашы продкі перадалі нампэўныя веды праз свой жыццёвы вопыт і свае назіранні, якія мы назіраем у прыказках і прымаўках. А нам застаецца падтрымліваць дадзеныя веды і развіваць іх у русле навукі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Моўныя залацінкі [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: https://sites.google.com/site/mounyazalacinki2016/prykazki-i-prymauki. – Дата доступа: 09.01.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ